**УДК 94(476)**

***Раман Галынскі***
*старшы выкладчык*
*кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь),*
*кандыдат гістарычных навук*

***Roman Halunsky***
*Senior Lecturer of the Social*
*and Humanitarian Disciplines dept.*
*of the Mogilev Institute of the Ministry*
*of Internal Affairs (Belarus),*
*Ph.D in History*

# ПОМНІКІ НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ В. КРАСНІЦА БЫХАЎСКАГА РАЁНА ЯК ПРЫКЛАД ЛЁСУ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

*Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі беларускага народа была самай яркай і адначасова самай жудаснай падзеяй. Можна, канешне, казаць і пра тое, што ў тыя гады вырашалася пытанне фізічнага існавання беларусаў і вялікай колькасці іншых народаў і нацыянальнасцей.*

*Мы прапануем разгледзець на прыкладзе гісторыі в. Красніца Быхаўскага раёна лёс шматлікіх іншых населеных пунктаў Беларусі ў часы Вялікай Айчыннай вайны. За аснову намі ўзяты помнікі на брацкай магіле ў азначанай вёсцы, падзеі і асобы, з імі звязаныя.*

Вёска Красніца размешчана на тэрыторыі Смаліцкага сельсавета Быхаўскага раёна. Баявыя дзеянні ўскосна закранулі вёску летам 1941 г. Шмат яе жыхароў былі мабілізаваны, ваявалі ў партызанах. Летам 1942 г. вёска была спалена са значнай часткай яе насельнікаў. Зімой – вясной 1944 г. за вёску двойчы вяліся цяжкія баі, і да ліпеня 1944 г. яна знаходзілася на прыфрантавой тэрыторыі. У гонар аб гэтых падзеях і людской трагедыі ў пасляваенныя часы былі паступова створаны помнікі, якія ўтварылі паўнавартасны комплекс [1–3].

Вайсковае пахаванне размешчана на паўднёва-заходнім ускрайку в. Красніца. Яно з’яўляецца адным з найбуйнейшых (па колькасці пахаваных і ўшанаваных) вайсковых пахаванняў у Быхаўскім раёне.

Комплекс складаецца з наступных элементаў:

1. Брацкая магіла. Гэта помнік гісторыі, які адзначаны ў «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць 1986 г.». Рашэннем Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады ў 2003 г. № 82 уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Аднаўлена ў 2021 г.

2. Помнік ахвярам фашызму. З'яўляецца помнікам гісторыі і адзначаны ў «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць 1986 г.». 17 ліпеня 1942 г., пасля таго як партызанамі быў збіты ў ваколіцах вёсак Кузькавічы, Красніца і Латкалонія нямецкі самалёт, гітлераўцы правялі карную аперацыю супраць мясцовых жыхароў. Помнік адноўлены ў 2021 г.

3. Помнік землякам. Гэта помнік гісторыі, які адзначаны ў «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць 1986 г.». Усталяваны на ўшанаванне памяці 95 воінаў-землякоў, партызан і мірных жыхароў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Аб'ект адноўлены ў 2021 г.

4. Помнік спаленым вёскам Быхаўшчыны ўсталяваны ў канцы 1990-х гг. Адноўлены ў 2021 г.

5. Памятная дошка Георгію Мяфодзьевічу Надтачэеву. Адноўлена ў 2021 г. [1–3].

Сярод пахаваных у брацкай магіле — байцы разнастайных падраздзяленняў (187-й стралковай дывізіі (далей — сд) 45-га стралковага корпуса Э. Я. Магона (далей — ск), 102-й сд і інш.), якія загінулі летам 1941 г., 324-й сд, 413-й сд, 80-га ск 50-й арміі (далей — А) Беларускага фронту (далей — БФ) і іншых падраздзяленняў, якія загінулі зімой – вясной 1944 г. на тэрыторыі Быхаўскага раёна. У 1959 г. на магіле ўсталяваны помнік — скульптура салдата з вінтоўкай. Пастаянна ў вайсковае пахаванне падзахоўваліся знойдзеныя ў ваколіцах вёскі (а ў 2020 г. — і на тэрыторыі ўсяго раёна) чырвонаармейцы і афіцэры. Усяго пахавана 911 абаронцаў Айчыны (вядомых — 821) [1–4].

Летам 1941 г. на поўнач і на поўдзень ад вёскі, а часткова і праз яе, адступалі падраздзяленні Чырвонай арміі. У асноўным гэта былі байцы 187-й сд, якія амаль усе загінулі ў баях у верасні 1941 г. у Беларусі. Афіцыйна дывізія была расфарміравана 1 лістапада 1941 г. [1–2; 5–16].

У сярэдзіне ліпеня 1942 г. у навакольных ад в. Красніца лясах партызанамі быў падбіты нямецкі самалёт. Лётчык выжыў і здолеў пасадзіць самалёт. Гітлераўцы амаль імгненна адрэагавалі. У гэты час

на Магілёўшчыне знаходзіліся падраздзяленні войск СС і карнікі з ліку калабарацыяністаў [2].

На працягу папярэдняга месяца акупантамі і іх пасобнікамі было спалена шмат вёсак і сёл у Кіраўскім, Клічаўскім і Быхаўскім раёнах, сярод іх Боркі, Студзёнка, Гарадзец (палілі некалькі разоў) і інш.

Гітлераўцы і калабарацыяністы акружылі вёску. Амаль усе працаздольныя вяскоўцы былі на касавіцы. Старым жыхарам абвясцілі аб неабходнасці склікаць усіх, быццам бы на перадзел зямлі. Сабраўшы сялян, мужчын сагналі ў калгасную пуню і расстралялі, а тых жыхароў, што засталіся, пачалі забіваць, дзе прыдзецца. Падчас рассрэлаў вёску падпалілі [2, с. 188–190, 212–214].

Падчас акцыі карнікамі і паліцаямі былі расстраляны ці спалены жывымі 696 жыхароў, спалены 283 двары [3, с. 143].

Першыя спробы авалодаць в. Красніца былі здзейснены 4–7 студзеня 1944 г. байцамі 110-й сд, 380-й сд і 413-й сд 50-й А. Несучы вялікія страты, байцы здолелі на некалькі гадзін заняць паўднёва-ўсходні ўскраек вёскі, прасоўваючыся праз в. Трылесіна і хутар Віляга з поўдня і з боку хутароў Мамачына з усходу. Пад моцным націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка, не маючы паўнавартаснай сувязі са штабамі палкоў і дывізій, пры адсутнасці поўнага ўзаемадзеяння з артылерыяй байцы адступілі на зыходныя пазіцыі [5–16].

У канцы сакавіка – пачатку чэрвеня 1944 г. падраздзяленні 413-й сд і 324-й сд вялі баі па авалоданні і ўтрыманні в. Красніца. Падраздзяленні 1095-га і 1093-га сп 25 сакавіка імгненнай атакай авалодалі першай і другой лініямі траншэй праціўніка. На подступах да трэцяй лініі траншэй, якая знаходзілася па ўзлессі, завязаўся працяглы рукапашны бой. Наступаючыя падраздзяленні біліся з выключнай упартасцю. Уведзены ў бой другі батальён 1091-га сп дружным кідком уварваўся на ўскраек лесу і знішчыў у рукапашным баі да сотні немцаў, авалодаў часткай трэцяй лініі траншэй, але, панёсшы вялікія страты, поспеху развіць не змог. Першы батальён 1091-га сп, які дзейнічаў правей, таксама замацаваўся ў трэцяй лініі траншэй, адбіўшы некалькі выключна жорсткіх контратак [5–16].

Для сакавіцкай аперацыі 1944 г. характэрны жорсткія баі ў траншэях праціўніка. У шматлікіх рукапашных схватках дробныя стралковыя падраздзяленні, дзейнічаючы часта ізаляванымі групамі супраць значна пераўзыходзячых па колькасці сіл праціўніка, паказалі высокае майстэрства і ўзоры гераізму.

Да 29 сакавіка нашы байцы занялі пазіцыі на навакольных вышынях і перайшлі да адбівання контратак гітлераўцаў і наладжвання абароны.

Вясной 1944 г. у брацкую магілу в. Красніца зроблены першыя пахаванні загінуўшых чырвонаармейцаў. У 1959 г. пастаўлены помнік з дзвюма таблічкамі «Вечная слава героям 1941–1945 гг.». У 2012 г. усталяваны гранітныя пліты з імёнамі (усяго 327 прозвішчаў). У 2016 г. дададзены дзве гранітныя таблічкі (спіс павялічыўся на 27 прозвішчаў). У межах правядзення пошукавых работ у брацкую магілу падзахоўваюцца астанкі знойдзеных чырвонаармейцаў. У кастрычніку 2020 г. здзейснена апошняе падзахаванне.

Ва ўшанаванне трагедыі в. Красніца штогод 17 ліпеня на помніку праводзіцца раённы мітынг-рэквіем. Мясцовыя жыхары ўскладаюць кветкі і здзяйсняюць акцыі, прысвечаныя дзяржаўным святам і памятным датам.

Акрамя таго, усталявана памятная дошка ў гонар Героя Савецкага Саюза Надтачэева Георгія Мяфодзьевіча. Нарадзіўся ён у в. Красніца ў 1916 г. Скончыў у 1940 г. Магілёўскі аэраклуб. Працаваў электраманцёрам на чыгунцы ў г. Магілёве. На фронце з чэрвеня 1941 г. Лётчык-штурмавік малодшы лейтэнант Г. М. Надтачэеў ажыццявіў 100 баявых вылетаў. 31 студзеня 1944 г. у час налёту на варожы аэрадром самалёт яго камандзіра быў падбіты і пайшоў на вымушаную пасадку. Надтачэеў жа агнём са свайго самалёта адагнаў гітлераўцаў ад машыны камандзіра і, падабраўшы экіпаж, вярнуўся на свой аэрадром. Не вярнуўся са штурмоўкі лініі ўмацаванняў праціўніка на Сапун-Гары (каля г. Севастопаля) 25 красавіка 1944 г. [2, с. 274–275].

Такім чынам, мы бачым паўнавартасную мемарыялізацыю падзей, звязаных з ходам Вялікай Айчыннай вайны ў межах адной лакацыі. На тэрыторыі вайсковага пахавання знаходзяцца пліты з імёнамі абаронцаў Айчыны і воінаў-вызваліцеляў, помнік воінам-землякам, загінуўшым на франтах вайны і ў партызанскай барацьбе, пліты з імёнамі землякоў — ахвяр генацыду, пліта ва ўшанаванне памяці земляка Г. М. Надтачэева — Героя Савецкага Саюза і помнік спаленым вёскам Быхаўшчыны.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Памяць. Беларусь. Рэспубліканская кніга / Беларус. Энцыкл. ; гал. рэд.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.). Мінск. : БелЭн, 1995. 624 с.

2. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Быхаўскага р-на / Беларус. Сав. Энцыкл. ; І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] ; Маст. А. М. Хількевіч. Мінск : БелСЭ, 1990. 576 с.

3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1986. 408 с.

4. В очередную годовщину трагедии деревни Красницы Быховского района, сожженной вместе с мирными жителями, у мемориала памяти будет зажжен Вечный огонь // Беларусь Сегодня. — URL: https://www.sb.by/articles/krov-ubitykh-sochilas-skvoz-polovitsy.html (дата обращения: 02.09.2024).

5. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 гг. : в 6 т. М. : Воениздат, 1960–1965. Т. 2 : Отражение советским народом вероломного нападения фашистской Германии на СССР. Создание условий для коренного перелома в войне (июнь 1941 г. – ноябрь 1942 г.). 1961. 682 с.

6. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 гг. : в 6 т. М. : Воениздат, 1960–1965. Т. 3 : Коренной перелом в ходе Великой Отечественной войны (ноябрь 1942 г. – декабрь 1943 г.). 1961. 652 с.

7. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 гг. : в 6 т. М. : Воениздат, 1960–1965. Т. 4 : Изгнание врага из пределов Советского Союза и начало освобождения народов Европы от фашистского ига (1944 год). 1962. 726 с.

8. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 гг. : в 6 т. М. : Воениздат, 1960–1965. Т. 5 : Победоносное окончание войны с фашистской Германией. Поражение империалистической Японии (1945 г.). 1963. 652 с.

9. История Второй мировой войны 1939–1945 : в 12 т. / глав. ред. комиссия: А. А. Гречко (пред.) [и др.] ; Институт военной истории Министерства обороны СССР [и др.]. Т. 4 : Фашистская агрессия против СССР. Крах стратегии «молниеносной войны». 1975. 536 с.

10. История Второй мировой войны 1939–1945 : в 12 т. / глав. ред. комиссия: А. А. Гречко (пред.) [и др.] ; Институт военной истории Министерства обороны СССР [и др.]. — Т. 5 : Провал агрессивных планов фашистского блока. — 1975. — 512 с.

11. История Второй мировой войны 1939–1945 : в 12 т. / глав. ред. комиссия: А. А. Гречко (пред.) [и др.] ; Институт военной истории Министерства обороны СССР [и др.]. Т. 6 : Коренной перелом в войне. 1976. 520 с.

12. История Второй мировой войны 1939–1945 : в 12 т. / глав. ред. комиссия: А. А. Гречко (пред.) [и др.] ; Институт военной истории Министерства обороны СССР [и др.]. Т. 7 : Завершение коренного перелома в войне. 1976. 522 с.

13. История Второй мировой войны 1939–1945 : в 12 т. / глав. ред. комиссия: А. А. Гречко (пред.) [и др.] ; Институт военной истории Министерства

обороны СССР [и др.]. Т. 8 : Крушение оборонительной стратегии фашистского блока. 1977. 536 с.

14. История Второй мировой войны 1939–1945 : в 12 т. / глав. ред. комиссия: А. А. Гречко (пред.) [и др.] ; Институт военной истории Министерства обороны СССР [и др.]. Т. 9 : Освобождение территории СССР и европейских стран. Война на Тихом океане и в Азии. 1978. 574 с.

15. История Второй мировой войны 1939–1945 : в 12 т. / глав. ред. комиссия: А. А. Гречко (пред.) [и др.] ; Институт военной истории Министерства обороны СССР [и др.]. Т. 10 : Завершение разгрома фашистской Германии. 1979. 544 с.

16. Они сражались на Быховщине. Издание Быховского историко-краеведческого музея. Быхов : Фил. МОУТ, 1988 г.

**MONUMENTS ON THE MASS GRAVE OF KRASNITSA, BYKHOV DISTRICT AS AN EXAMPLE OF THE FATE OF A BELARUSIAN VILLAGE DURING THE GREAT PATRIOTIC WAR**

*In this way, we see a full-fledged commemoration of events related to the course of the Great Patriotic War. On the territory of the military burial there are plaques with the names of defenders of the Motherland and liberating soldiers, a monument to compatriots who died on the war fronts and in partisan struggle, plaques with the names of compatriots who were victims of the genocide, a plaque commemorating the memory of the hero of the Soviet Union (Nadtocheev G. M.) and a monument to the burnt villages of Bykhov region.*